**УДК 94(476)1944/1945**

# ВЫЖЫВАННЕ ПАСЛЯ ВЫЗВАЛЕННЯ: ВЁСКА ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ Ў ДЫСКУРСЕ ВУСНАЙ ГІСТОРЫІ 1944 – 1945 гг.

***канд. гіст.навук, дац. А.В. СУМКО***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаецца спецыфіка жыццезабеспячэння беларускай вёскі ва ўмовах разбуранай эканомікі ў ваенны час на вызваленых ад нацыстаў тэрыторыях. У якасьці крыніц выступілі матэрыялы вуснай гісторыі, якія дазваляюць зразумець дынаміку разглядаемай праблемы і зафіксаваць пэўную карціну, створаную калектыўнай памяцьцю насельніцтва Паўночнай Беларусі.*

*У тэксце прадстаўлены вынікі палявых экспедыцый 2000-х гадоў.*

***Ключавыя словы:*** *пасляваеннае аднаўленне, экстрэмальная гастранамія, голад, вёска, сельская гаспадарка, абмен і гандаль, жыццязабеспячэнне.*

**Уводзіны.** Сукупнасць спосабаў фізічнага выжывання людзей уяўляла сабой спецыфічную сістэму жыццезабеспячэння, якая склалася ў экстрэмальных умовах ваеннага часу. Спадзяванні на паляпшэнне жыцця адразу пасля вызвалення спраўджаны быць не маглі, бо эканоміка краіны і сельская гаспадарка ў прыватнасці знаходзілася ў надзвычай цяжкім становішчы ў выніку ваенных дзеянняў і акупацыі. Людзі былі вымушаныя змагацца за выжыванне, максімальна выкарыстоўваючы ўсе наяўныя рэсурсы, бо вызначальным заставаўся лозунг “Усё для фронту! Усё для перамогі!”, дзеля рэалізацыі якога адбывалася максімальнае выкачванне рэсурсаў з вёскі. У надзвычай экстрэмальных умовах апынуліся жыхары тых раёнаў, дзе нацысты ў барацьбе з партызанамі праводзілі палітыку “выпаленай зямлі”.

Актуальнасць даследавання заключаецца ў тым, што сістэма жыццезабеспячэння беларускай вёскі ў ваенны час на вызваленых ад нацыстаў тэрыторыях як складаны эканамічны і соцыякультурны феномен недастаткова асвятлялася ў айчыннай гістарыяграфіі. Як адзначае Вольга Лабачэўская ”гістарычная навука была сканцэнтравана на вывучэнні ваенных, ваенна-палітычных і ваенна-эканамічных аспектаў і характарызавалася “событийным” падыходам, у рамках якога асвятляліся ход баявых дзеянняў, буйныя бітвы, героіка вайны” [1, с. 39]. Адносна нядаўна ў межах гістарычнай антрапалогіі і гісторыі штодзённасці прадметам вывучэння стаў “маленькі чалавек”. Айчынныя прафесійныя гісторыкі пачалі актыўна выкарыстоўваць вусныя ўспаміны ў даследчыцкіх практыках. Праз наратыўны аналіз, катэгорыі калектыўнай і індывідуальнай памяці, суаднясенне і верыфікацыю, вусны ўспамін паўстае як крыніца даследавання малазадакументаваных ці незадакументаваных гістарычных падзей і з’яў, прапануе іншы ракурс для ацэнкі фактаў зафіксаваных у гістарычным дыскурсе [2, с. 30]. На сённяшні момант назапашаны значны комплекс вуснагістарычных крыніц, якія захоўваюцца ў асабістых архівах ці архівах грамадскіх і навуковых устаноў, онлайн-сховішчах. Біяграфічны наратыў Беларускага архіву вуснай гісторыі[1] быў выкарыстаны ў кнізе Вольгі Івановай “Прамоўленая гісторыя: XX ст. у памяці жыхароў беларускай вёскі”, якая з’яўляецца адной з першых спроб паказаць гісторыю Беларусі скрозь прызму вусных успамінаў звычайных вясковых жыхароў.

У якасці крыніц даследавання выступаюць уласныя запісы аўтара, а таксама матэрыялы палявых этнаграфічных экспедыцый Полацкага дяржаўнага ўніверсітэта, які мае значны вопыт у фіксацыі, дакументаванні і архівацыі экспедыцыйных матэрыялаў, а таксама вялікую базу біяграфічных наратываў, якія адлюстроўваюць розныя аспекты гісторыі і культуры Беларускага Падзвіння. Неабходна адзначыць, што большасць рэспандэнтаў – пераважна пажылыя вясковыя жанчыны даваеннага пакалення (1920 – 1930-х гадоў нараджэння), якія былі ў разглядаемы перыяд дзецьмі або падлеткамі. Успаміны адрозніваюцца эмацыянальнасцю, што абумоўлена спецыфікай дзіцячага ўспрымання гістарычных падзей, на інтэрпрэтацыю якіх уплываў вопыт сям’і рэспандэнта (сацыяльнага асяроддзя). Характар фіксацыі пасляваенных рэалій у індывідуальнай памяці мае свае асаблівасці: прыярытэт лакальнай гісторыі, кампрэсія гістарычнага часу, умоўная храналагічнасць альбо яе адсутнасць. Напрыклад, выраз “калі скончылася вайна” разумеецца рэспандэнтамі ў першую чаргу як “вызваленне ад немцаў” і толькі пасля гэтага як завяршэнне Вялікай Айчыннай вайны: “*Да вайны трое нас было, а вось пасля вайны, у 1944, радзілася ў мяне яшчэ сястра*”[2]. Аповяды пра “выжыванне пасля вызвалення” насельніцтва Паўночнай Беларусі маюць сваю спецыфіку, якую вызначае геаграфічная лакацыя. *Геаграфічныя* рамкі даследавання абдымаюць тэрыторыю Паўночнай Беларусі (Беларускае Падзьвіньне), гісторыка-этнаграфічны рэгіён, што ў разглядаемы перыяд адміністрацыйна ўваходзіў у склад Полацкай і Віцебскай абласцей, сацыяльна-эканамічныя адрозненні паміж якімі былі абумоўлены ўключэннем у склад першай раёнаў (Браслаўскі, Відскі, Глыбоцкі,

[1] On-line сховішча электронных дакументаў па вуснай гісторыі Беларусі XX ст. (http://www.nashapamiac.org)
[2] Зап. Грэбень Я., Корсак А., Сумко А. у 2017 г. ад Галоўка Анны Ігнатьевны, 1935 г.н., в. Міські Пастаўскі р-н.

Дзісненскі, Докшыцкі, Дунілавіцкі, Мёрскі, Плiскі і Шаркаўшчынскі), якія да 1939 г. уваходзілі ў склад Польшчы, дзе пераважала аднаасобная гаспадарка. У выніку рэгіён меў у сваім складзе раёны з рознымі тыпамі сацыяльна-эканамічнага ўкладу і, адпаведна, розным узроўнем дабрабыту насельніцтва. Сацыяльна-эканамічны разлом паглыбілі неаднолькавыя стартавыя ўмовы пасляваенага аднаўлення, бо заходнія рэгіёны з большага знаходзіліся ў лепшай гаспадарчай сітуацыі, чым усходнія, дзе праводзіліся спусташальныя карныя аперацыі, падчас якіх у першую чаргу цярпела грамадзянскае насельніцтва.

**Асноўная частка.** Матэрыялы вуснай гісторыі фіксуюць, што ваенная рэчаіснасць пасля вызвалення захавала сваю злабадзённасць. Пагроза для жыцця перш за ўсё зыходзіла ад узброенага супраціву, якое актыўна дзейнічала ў заходніх раёнах Віцебшчыны (Глыбоцкі, Пастаўскі, Дзісенскі, Шаркаўшчынскі, Дунілавіцкі, Браслаўскі, Мёрскі, Відскі, Докшыцкі), для якіх была ўласціва больш высокая ступень антысавецкага настрою, абумоўленая непрыняццем пэўнай часткай грамадства савецкіх парадкаў, усталяваных пасля 1939 г. У даведцы арганізацыйна-інструктарскага аддзела ЦК КП(б)Б "Аб кіраўніцтве Полацкага абкама КП(б)Б заходнімі раёнамі вобласці" ад 4 верасня 1945 г. адзначалася, што большасць удзельнікаў узброенага супраціву – гэта мясцовыя жыхары, якіх актыўна падтрымлівае "кулацкая часть села" [3, с. 394]. Рэспандэнты заходніх раёнаў адзначалі стракатасць узброеных атрадаў, што праследавалі розныя мэты. "После нашай Вялікай Ацечэсвеннай вайны банды былі, убівалі людзей. Гэта людзі разные былі. Гэта людзі, каторые, можна сказаць, процiў савецкай уласьці. Хадзілі ў польскіх этых… какіе там арлы там былі. Вайна акончылась, а банды былі, каторыя баялісі чаго-та. Награшылі напроць савецкай власьці, пашлі ў кусты (Шаркаўшчынскі р-н) [4, с. 264]. *"Дезертіры хадзілі пасля вайны групамі варужоныя, пры немцах яны не служілі.. Міхась Каранеўскі, вясковы хлопец у дезерціры пайшоў, каб на вайну не ісці. Усю вайну хаваліся ў лесе недалека ад Калітаў – Гарохавы лес звалі – Гарохаўе. Настаяшча было, больш за шэсць чалавек"* (Пастаўскі р-н)[3]. Неабходна адзначыць, што пасля татальнага гвалту акупацыйнага перыяду любыя нелегальныя групы са зброяй у руках успрымаліся вясковай большасцю (хіба за выключэннем блізкіх сваякоў) як патэнцыйная пагроза ва ўжо мірны (пасля вызваленьня) час. І калі, нават гвалтоўныя, дзеянні партызан маглі знаходзіць рацыянальнае апраўданне ў кантэксце іх антаганічнасці нямецкім акупантам, то пасляваенны партызан, а часта рэальны злодзей ці дэзірцір, як змагар не разглядаўся і ў большасці выпадкаў ідэнтыфікаваўся як бандыт.

Сур'езную небяспеку для жыцця прадстаўлялі замініраваныя ворныя палі, бальшакі, ускраіны лесу і г.д. Успаміны фіксуюць даныя пра ахвяры і няшчасныя выпадкі ад кінутых боепрыпасаў і схаваных мін. Прычым большасць аповядаў прыходзіцца на ўсходнія раёны рэгіёна (Верхнядзвінскі, Асвейскі, Ветрынскі, Полацкі, Расонскі, Ушачскі). "*Мяне зьвязлі ў Боркавічы. А тады гляжу вядуць нейкую бабу і нагі нету ў яе – пратэз. Аж гэта яна после вайны ішла ў Боркавічы і па бальшаку па пяшчанаму і на міну ўзышла. Замініраваны быў бальшак*" (Верхнядзвінскі р-н) [5, с. 142]. У групу рызыкі ў першую чаргу траплялі дзеці і падлеткі: "*Ва двор прыбеглі мальчышкі маленькія і сталі капаць. Капалі, капалі, а міна взарвалася, і аднаму кісць адарвала"* (Ушачскі р-н) [4]; *"Адзін мальчышка каля дзярэўні капсулю знайшоў, ад міны можа не разарваўшайся, разарвала яго"* (Расонскі р-н)[5].

Пасля вызвалення разглядаемы рэгіён знаходзіўся ў надзвычай цяжкім эканамічным становішчы. Агульная колькасць сельскага насельніцтва Віцебскай вобласці (14 раёнаў) на 1 студзеня 1945 г. складала 433,8 тыс. чалавек (61% ад даваенных даных), па ўсходніх раёнах (6 раёнаў) Полацкай вобласці – 123,5 (52,3%), па заходніх (9) раёнах Полацкай вобласці – 241,2 (75,5%) [3, с. 241–242]. Катастрафічнае становішча ў тых раёнах, дзе нацысты ў барацьбе з партызанамі праводзілі палітыку "выпаленай зямлі", адлюстравана ва ўспамінах вяскоўцаў: "*У нас спалілі ўсё датла ў 44-м гаду. Вясной усіх выгналі з дзярэўні, на падводы… У Зябкі ў баракі гналі нас*"[6] (Глыбоцкі р-н); "*А на вясну мы прыехалі. 23 апрэля мы прыехалі, так а што ж мы прыехалі.. Стаяць коміны і ўсё*"[7] (Пастаўскі р-н). Аднак пераважная большасць буйных карных экспедыцый нацыстаў ("Winterzauber", "Waldwinter", "Schneehase", "Greif" і інш.) была праведзена менавіта ва ўсходняй частцы рэгіёна, дзе партызанскі рух быў куды больш інтэнсіўным. *"Уся дзярэўня згарэўшы, вот акрамя вуглакі не былі згарэўшыя … А тут усе, усе пагарэўшы. Весь Расонскі раён, считай, згарэўшы* (Расонскі р-н)[8]. Наступствы нацысцкай акупацыі тут насілі надзвычай спусташальны характар. Напрыклад, на тэрыторыі Асвейскага раёна не засталося ніводнай цэлай пабудовы.

Пасля вяртання на вызваленую тэрыторыю людзі жылі ў зямлянках, лазнях, непрыстасаваных для пражывання памяшканнях: "Прышлі з адступлення на сваю ўсадзьбу – усё згарэлае было, толькі трубы гэты коменныя. З яловых лапак мамка будку здзелала нам, пасадзіла як сабачанят, шэсць дзяцей" (Бешанковіцкі р-н) [6, с. 220]; *"Жылі ў акопе не адны, а потым тата зрабіў будку, абшыў саломай і жылі"* (Пастаўскі р-н) [9]; *"На пянёк сталі,*

[3] Запісана аўтарам (ЗА) у 2016 г. ад Кісялёвай Чаславы Філіпаўны, 1942 г.н., в. Каліты Пастаўскага р-на.
[4] ФА ПДУ : Зап. Аўласавай Н. ад Дорц Ніны Яўхімаўны, 1935 г.н. в. Быстрыкі Ушацкага р-на.
[5] ФА ПДУ : Зап. Лобач У. у 2019 г. ад Кандрацьева Франца Францавіча, 1928 г.н., в. Янкавічы Расонскага р-на.
[6] ФА ПДУ : Запі.у 2018 г. ад Гіль Феофаніі, 1942 г.н., в Калечполе Глыбоцкага р-на.
[7] Зап. Грэбень Я., Корсак А., Сумко А. у 2017 г. ад Галоўка Анны Ігнатьевны, 1935 г.н., в. Міські Пастаўскі р-н.
[8] ЗА у 2019 г. ад Высоцкай Таісіі Іванаўны, 1935 г.н., в. Галоўчыцы Расонскага р-на.
[9] Зап. Грэбень Я., Корсак А., Сумко А. у 2017 г. ад Галоўка Анны Ігнатьевны, 1935 г.н., в. Міські Пастаўскі р-н.

*пастаялі,пакруціліся, нічога не было. Тады паехалі, тут у Ражнове нямецкія бункеры былі, мы с сясрой тады узялі такую павозку, (была нямецкая), калесы такія бальшыя-бальшыя. І мы паехалі за даскамі, тут разабралі акоп. Вот мы тых дасок надралі, а з нашай бані асталося, ну вот такі вянок. Ну вот павязем жа гэтых дасок і гаворым: "Будзем дзелаць сабе якую-небудзь хату. Жыць то нада. І вот цягнулі гэні доскі. На сабе, вот яна з 27 года, а я з 28 г. Панімаешь? І наклалі столькі дасок, так надраліі. Мы цягнулі, я да кладбішча дацягнула, а тады завалілася на кладбішчы і гавару, ды і цяпер не забылася, легла і галашу, гавару: "Каб я сябе гэтыя доскі на гроб прыцягнула, каб я памерла, як я ужо жыць не хачу." Дужа цяжка, а пясок, а калёсы гэтыя рэжуцца. Так вот і зажыліся, баньку троху накрылі, там неяк зделалі і сядзелі ў гэтай бані"* (Расонскі р-н).[10]

Успаміны вяскоўцаў фіксуюць, што вельмі актуальнай была праблема фізічнага выжывання на спустошанай тэрыторыі, калі пагроза гвалтоўнай смерці ад нацыстаў ці паліцаяў знікла, а на першае месца выйшла пагроза смерці ад голаду: *"Пасля вайны нічога год не пахаўшы..Нічога не было"* (Расонскі р-н)[11]. Жыхары знішчаных вёсак, каб элементарна выжыць, вымушаны былі займацца жабрацтвам, якое ў першы год пасля вызвалення набывае масавы характар: "*Мы і хадзілі… Ай, якія дзярэўні былі туды і хадзілі. Так і выжылі.*"(Расонскі р-н)[12]. Жабраваць хадзілі ў раёны, якія больш захаваліся пасля вайны, пераважна ў заходнюю частку Віцебшчыны, якая была ў параўнальна лепшай гаспадарчай сітуацыі, чым разбураныя ўсходнія раёны. "*Мы не хадзілі, а да нас пасля вайны з васточнай Беларусі прыхадзілі. Яны ж там папаленыя былі, бедна жылі, так ішлі да нас. Прыйдуць, паглядяць ёсць ці абраз, перакрэсцяцца і "Падайце радзі Хрыста"…і так ішлі, ішлі, ішлі…*"(Глыбоцкі р-н)[13].

Вусны дыскурс голаду і экстрэмальнай гастраноміі перыяду акупацыі захоўваецца і ва ўспамінах пра перыяд пасля вызвалення. У ежу ішло ўсё, што можна было есці: "*Страшна было. Страшны голад быў. Коні здахалі, людзі падлу елі*" (Расонскі р-н) [14]. У першы год пасля вызвалення самым актуальным прадуктам была мерзлая бульба, якая засталася на палях. *"После ж вайны есць саўсім нечага было. А после ж вайны ўсё асталося на зіму. Вясной тады сабіраем гэтую бульбу гнілую. Мы яе і пяклі, і варылі, і елі гэту гнілую бульбу"* (Шумілінскі р-н) [15]. Звычайна збіралі мерзлую бульбу на непрыбраных калгасных палях. Насельніцтва раёнаў, якія межавалі з былой польскай мяжой, хадзіла перакопваць палі сялян-аднаасобнікаў. Некаторыя рэспандэнты ўспаміналі, што гэта часам ацэньвалася гаспадарамі негатыўна: **"***Пасля вайны вот гэту, пасля зімы, значыць, картошку, ну, есці нечага было, так хадзілі гэтую картошку сабіралі, мёрзлую такую, гнілую. Вясной. Дык нас ганялі, мол, што вы агароды топчыце. А яны то жылі нармальна. Патаму што там усе былі еділічнікі, калхозаў не было. Так вот мы ўсё звалі «западонцы»* (Полацкі р-н) [16]. Па меры ўзмацнення голаду людзі былі гатовыя есць усё, нягледзячы на агіду. На смак не звярталі ўвагі, толькі б знайшлося тое, што магло здаволіць страшны голад і дазволіла б выжыць: *"Траву во елі эту. Шчавель расцёт такі, цвецёт высокі (шчаўлюк). Сморгалі і пяклі эты ляпёшкі. Лашадзей калхозных выцягвалі дохлых. Вон, хадзілі з маткай, абразалі і елі. Вот так і выжылі"* (Полацкі р-н)[17].

Выратаваннем былі гаспадарчыя ямы, у якія зарывалі прадукты і рэчы, каб захаваць іх на выпадак экстрымальнай сітуацыі. *"Усе Каліты былі спалены толькі 4 хаты былі астаўленыя. Бедна жылі. Мала хлеба было. Мы жылі ў таку, каб дзе жыць было. Печь была зроблена вялікая. Палок быў зроблены, бо сям'я вялікая была. Пасля пажару схавалі зерна. Мама у хаце выкапала яму і там хавала, а пасля таго як хата згарэла, мама раскапала. Хлеб пяклі, але слаба хлеба там было, бульбу дабаўлялі"* (Пастаўскі р-н) [18]. Аднак вельмі распаўсюджанымі былі выпадкі, калі схаваныя гаспадарамі прадукты выкапвалі іншыя і сям'я аказвалася ў вельмі складаных умовах выжывання: "*Як атхадзілі ў лес, то усё закапалі. Ну, а як вярнуліся ўжо ў ямах нічога не было, ужо выграблі*" (Расонскі р-н)[19].

Некаторыя рэспандэнты казалі пра тое, што захавалі ў памяці і пранеслі праз усё жыццё смакавыя адчуванні пасляваеннай гастраноміі: *Пасля вайны такія смачныя дранікі з мерзлай бульбы былі. Ну, яна сладкая была. Тады я не знаю якім яна (**мама**) повадам даставала льносемя, малолі ўжо і яна пірагі пекла, я толькі да роту і не магла, ну не магла я іх перанесці. А з канаплі любіла клёцкі. Яна высокая-высокая. У нас там у Барсуках, каля фермы было поле бальшое, мы з братам пабяжом, нацярушым, тады мама на вецер выцерушывала, а тады ў ступу. А што будзем варыць? Ай, клёцачкі…* (Верхнядзвінскі р-н)[20].

---

[10] ФА ПДУ : Зап. Сумко А. у 2019 г. ад Кандрацьевай Надзеі Антонаўны, 1928 г. , в. Янкавічы Расонскага р-на.
[11] ФА ПДУ : Зап. Лобач У. у 2019 г. ад Кандрацьва Франца Францавіча, 1928 г.н., в. Янкавічы Расонскага р-на.
[12] ЗА у 2019 г. ад Высоцкай Таісіі Іванаўны, 1935 г.н., в. Галоўчыцы Расонскага р-на.
[13] ФА ПДУ : Зап. Мяховіч П. ад Рабкоўскага Віктара Нікалаевіча, 1933 г.н., в. Кавалеўшчына Глыбоцкага р-на.
[14] ЗА у 2019 г. ад Высоцкай Таісіі Іванаўны, 1935 г.н., в. Галоўчыцы Расонскага р-на.
[15] ФА ПДУ : Зап. Лобач. У., Аўсейчык У. у 2017 г. ад Тапаковай Веры Сцяпанаўны, 1934 г.н., в. Светлічашча Шумілінскага р-на.
[16] ФА ПДУ : Зап. Лобач. У., Сумко А. у 2018 г. ад Рудзёнка Фёдара Антонавіча, 1937 г. н, в. Загацце Полацкага р-на.
[17] ФА ПДУ : Зап. Лобач. У., Сумко А. у 2018 г. ад Рудзёнка Фёдара Антонавіча, 1937 г. н, в. Загацце Полацкага р-на.
[18] ЗА у 2016 г. ад Кісялёвай Чаславы Філіпаўны, 1942 г.н., в. Каліты Пастаўскага р-на.
[19] ЗА у 2019 г. ад Таратуткі Любові Ягораўны, 1927 г.н, в. Галоўчыцы Расонскага р-на.
[20] ЗА у 2018 г. ад Гайбут Веры Кірылаўны, 1941 г.н. , в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

Неабходна адзначыць, што так як большасць рэспандэнтаў у пасляваннны час былі дзецьмі, то цэнтральнай фігурай ва ўспамінах выступае постаць мамы, якая выратоўвала як магла. Увогуле жанчыны ў паваенны час былі найбольш дзеяздольнай групай, а сям'я, у якой быў працаздольны мужчына лічылася заможнай: "А чаму яны былі багатыя? – *Мужыкі былі, у ў нас нікога"* (Полацкі р-н)[21]; *"Мы не галадавалі, у нас тата быў"* (Верхнядзвінскі р-н)[22].

Важнай крыніцай жыццезабеспячэння ў разглядаемы перыяд стала збіральніцтва і рыбалоўства. Рэспандэнты адзначалі, што збіральніцтва дапамагала, калі "*асобенна пара такая была голодная, кагда зерно наліваецца і его нельзя сжаць, а хлеба уже нет*" (Верхнядзвінскі р-н)[23]; "*Сушылі, елі самі. Карміліся толькі гэтым*" (Расонскі р-н)[24]. Зборам займаліся пераважна дзеці рознага ўзросту, дарослыя займаліся гэтым у меншай ступені, бо былі занятыя ці ў калгасе, ці ў сваёй гаспадарцы. Прадукты збіральніцтва ўключаліся ў паўсядзённы рацыён, а таксама былі крыніцай заробку. "*Як была дзеўкай, як няма што есці, дык тады, карова была, малака, ягада чарніка, наберыш і паясі, а тады ў малако насыпеш і лыжкай гэтыя ягады чарнікі і з малаком. Як танцаваць пойдзеж дык у бруху толькі клём-клём гэтыя ягады*" (Браслаўскі р-н) [25]; **"***Я помню мы сабіралі клюкву, а тады ў Баравуху пяшком насілі, стаканам прадавалі. Вясной, з-пад зімы (яна астаецца харошая клюква) насілі прадаваць стаканамі. Пакупалі людзі, там жа ваенныя афіцэравы жоны былі, куплялі. І вось клюкву прададзім, купім 2-3 скібкі хлеба і дамоў прыйдзем.*" (Расонскі р-н) [26]. Звычайна дзеці сядзелі, каля базара, бо гэта была не зусім легальная дзейнасць, але мясцовыя органы парадку з большага не ганялі малых, бо разумелі складанасць сітуацыі: " (А міліцыя ганяла на рынку?) *Не, мы сядзелі пад заборам, около базара. Тетрадка у нас, нада ж было круціць. Дзякуй Богу, мы ні разу дамоў не прыняслі"*(Верхнядвінскі р-н)[27]. Вяскоўцы ўзгадвалі, што вельмі запатрабаваным было рыбалоўства: "*Рыба – гэта ж самая еда была*"; "*Лавілі рыбу і рыбы было многа.* – (А лавілі для сябе ці прадавалі?) – *Канешне. Менялі. Восем кілаграм ляшчоў, а яна мне пол ведра бульбы.* – (Пол ведра?) – *Пол ведра, мелкай.*" (Расонскі р-н) [28]. Рыба была важным харчовым рэсурсам, які дазваляў выжыць у складаных умовах, а таксама выступала ў якасці сродка для абмену на іншыя прадукты харчавання.

Матэрыялы вуснай гісторыі фіксуюць, што адной з крыніц жыццезабеспячэння, асабліва ва ўмовах голаду, нярэдка станавіліся агульнакалгасныя рэсурсы: "*Адкудата прывязлі свяклы, не краснай, для ската і вот эту свёклу елі. Одна жэншчына взяла 3 свяклы, а ў яе трое дзяцей дома і есці каб што. Прынесла чтобы іх сварыць, яе паймалі і далі тры гады тюрмы.*" (Расонскі р-н) [29]. (А з калхоза што-небудзь бралі?) – *Толькі зажываліся. Помню жыта паспела недалёка ад нас. Мама мяне паслала ў калосся – нарэзаць калоссяў. Я днём пайшла, зашла ад лесу, прысела так во і ножнічкамі шчып-шчып у такую каробачку, а жорны свае у нас былі. А аб'ездчык, так называўся, ездзіў на кані і аглядаў, увідзіў і мяне за лапу валок да прадседацеля, а я плакала. Ен з 31 года, малец гэты, яго бацька быў кладаўшчыком, так ён голада не відзіў. Голад застаўляў усё дзелаць.*" (Расонскі р-н) [30]. Гэта стварала цяжкія сітуацыі для калгаснага кіраўніцтва, якое павінна было перасследваць у судовым парадку ўсе інцыдэнты, але ведала, што многія з іх работнікаў залежалі ад выкрадзеных прадуктаў харчавання, каб перажыць дрэнны ўраджай і няздольнасць калгасаў забяспечыць аплату працы [7, с. 65]. Іншы раз калгаснае кіраўніцтва, улічваючы катастрафічнае становішча людзей, заплюшчвала вочы на падобныя сітуацыі, заклікаючы ведаць меру.

Дрэннае харчаванне і ўмовы пражывання ў непрыстасаваных памяшканнях адбіваліся на стане здароўя. Адной з надзённых праблем было татальнае распаўсюджанне паразітаў: *"А як жа вошы былі заеўшы. Мы ж не маглі спаць. Я помню, што ў Пецькі Грамза была памёршы бабушка. Я малая была, гады тры было, но трошку саабражала. А яе ўсю ватай аблажыўшы, ватай белай. Ну, сядзём-сядзем, чую мама і кажа "во, выпаўзаюць жа". Яна застыла, каляная, ім недзе нічога браць, тады ватай абкладалі гэтых пакойнікаў і харанілі. Абкладалі, каб ня вылезлі наружу"* (Верхнядзвінскі р-н) [31]. У першы год пасля вызвалення па Віцебшчыне пракаціліся эпідэміі сыпнога тыфа, дызентырыі. Цікавым падаецца тлумачэнне з'яўлення эпідэмій: "Трасца. Як вайна кончылася, так гэта хвароба і пакацілася. Страшная. (А адкуль яна?) – Ну, яна после вайны была ад во гэтага, што воздух быў такі, і людзі бітыя былі. Скрозь было, што выйці неяк было, дышаць нечым было. Сядзеш, дык вецер як адтуль пацягнець з лесу, дык дышаць неяк было. Гэта трасца, яна і называлася трасца, ну яна як ціф во гэтат. Ціф во гэтыт так каціў, а тады во гэта

[21] ЗА у 2018 г. ад Гураўчанка Валянціны Грыгор'еўны, 1928 г.н., в. Махірова Полацкага р-на

[22] ЗА у 2018 г. ад Снежын Станіславы Грыгор'еўны, 1923 г.н. у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

[23] ЗА у 2018 г. ад Немянёнак Ванды Міхайлаўны, 1936 г.н. у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

[24] ФА ПДУ : Зап. Сумко А. у 2019 г. ад Кандрацьевай Надзеі Антонаўны, 1928 г.н, в. Янкавічы Расонскага р-на.

[25] ФА ПДУ : Зап. Сяргун В.І у 2018 г. ад Ядзялы Станіславы Адольфаўны, 1927 г.н. у в. Ёдлавічы Браслаўскага р-на.

[26] ЗА у 2019 г. ад Высоцкай Таісіі Іванаўны, 1935 г.н., в. Галоўчыцы Расонскага р-на.

[27] ЗА у 2018 г. ад Гайбут Веры Кірылаўны, 1941 г.н. у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

[28] ФА ПДУ : Зап. Лобач У. у 2019 г.ад Кандрацьева Франца Францавіча, 1928 г.н., в. Янкавічы Расонскага р-на.

[29] ЗА у 2019 г. ад Таратуткі Любові Ягораўны, 1927 г.н., в. Галоўчыцы Расонскага р-на.

[30] ЗА у 2019 г. ад Высоцкай Таісіі Іванаўны, 1935 г.н., в. Галоўчыцы Расонскага р-на.

[31] ЗА у 2018 г. ад Гайбут Веры Кірылаўны, 1941 г.н. у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

трасца. Ну, тады загаворы якія хто, зёлкі” [5, с. 235]. Матэрыялы вуснай гісторыі фіксуюць вяртанне да традыцыйных метадаў лячэння, актуалізацыю народных ведаў аб раслінах і выкарыстанне іх лекавых уласцівасцей: “*Ну, а тады пасля, ужо не знаю чым, і вошы гэтыя пайшлі, а блохі засталіся. А блохі аіру баяліся. Нехта ж падсказываў. Мама калі пойдзець куды-небудь, там на сабранне, а мы з братам бягом у стаўкі, аіру гэтага налупім і абкладаліся....*” (Верхнядзвінскі р-н) [32].

Дзень Перамогі большасць рэспандэнтаў калектывізаваных да 1939 г. раёнаў сустрэла на калгасных палях за працай: “*Тут во мы садзілі бульбу, я была ў плугу за каня ... утраіх цягнулі плуг. Прадседацель прыляцеў на кані: “Бабухі, мір!”* (Верхнядзвінскі р-н)[33]. Яшчэ ў ліпені 1944 г. ЦК КП(б) і СНК БССР прынялі пастанову “Аб аднаўленні калгасаў у вызваленых ад нямецкіх захопнікаў раёнах Беларускай ССР”, згодна з якой на працягу ліпеня-верасня арганізацыйна трэба было адрадзіць калгасы і правесці ўборку ўраджаю і сяўбу азімых [8, с. 10]. У заходніх раёнах у паваенны час пераважалі аднаасобныя гаспадаркі, а колькасць калгасаў была нязначнай. У адноўленых сельскіх гаспадарках не хапала цяглавай сілы, сельскагаспадарчых машын і інвентру, кармоў для жывёлы: “*После ж вайны мы на сабе плугі цягалі. А после вайны нікакіх коней не было: сорак чацвёрты, пяты, шосты... У лес ездзілі, лес рубілі, а ў самой на назе адзін бацінак, на другой – нямецкі бот, толькі я яго абрэзала. А, патом, хто-та даў мне бацінкі нямецкія, і я хадзіла ў іх тры гады.*” (Бешанковіцкі р-н)[34].

Паваенная калгасна-саўгасная сістэма, пры значным скарачэнні матэрыяльных і працоўных рэсурсаў, павінна была забяспечыць неабходны ўзровень вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі для дапамогі фронту і мабілізаваць насельніцтва на выкананне абавязковых паставак, якія былі часам непад’ёмнымі для жыхароў знішчаных весак, у першую чаргу, усходніх раёнаў: “*После самай вайны, толькі прышлі, ні спаць было дзе, ні накрыцца, а нада было здаць 40 кілаграм мяса. А дзе мы возьмем 40 кілаграм мяса? Ну і прышлі апісваць. Прышлі ў хату і былі нейкую падушку нашоўшы, і таз нейкі іржавы быў, больше ніякай пасудзіны не было, ні сесці, ні стала. І вынеслі падушку і таз паставілі ў угал. Сказалі, што прыедзіць машына і заберыць, але нешта не прыехалі.*” (Расонскі р-н)[35]. Дырэктывы зверху іншы раз не ўлічвалі рэальнае эканамічнае становішча канкрэтнай мясцовасці і патрабавалі выкананне абавязковых паставак у поўным аб’ёме. У адказ кіраўніцтва раёнаў дасылала ў абкам эмацыянальныя лісты, дзе пазначалася немагчымасць выканаць дырэктывы. Напрыклад, у лісце старшыні Ушачскага райсавета адзначалася наступнае: “Неужели до сих пор облисполкому и обкому не ясно положение в нашем районе? В 1943 – 44 гг. (до экспедиции) на территории нашего р-на располагались партизанские отряды Мельникова, Уткина, Романова…И для того чтобы прокормить всю эту партизанскую армию, нам пришлось доводить до колхозников 5 обязательных поставок по хлебу, картофелю и организовать множество добровольных сборов. А оставшееся у крестьян и партизан продовольствие было изъято немцами во время экспедиции. Картофеля и овощей урожая 1944 г. мы вообще не в состоянии сдать даже одной тонны, т.к. этих культур весной 1944 г. в районе не сажалось по причинам той же немецкой экспедиции. В отношении сдачи в этом году мяса, молока, масла, яиц и шерсти также выполнить не можем, так как у нас в районе не осталось ни одной курицы, ни одной овцы.” [3, с. 240]. Другія кіраўнікі спрабавалі выканаць дырэктывы праз прымус, як гэта было ў Браслаўскім раёне, дзе збор абавязковых паставак хлеба ў некаторых сельсаветах праходзіў пад пагрозай зброі, а мабілізацыя працоўнай сілы – метадам начных аблаў з удзелам міліцыі і знішчальнага атрада [3, с. 289]. План хлебанарыхтовак у Полацкай вобласці да 15 верасня 1945 г. быў выкананы толькі на 25,2%, што было ў два разы ніжэй за агульнарэспубліканскі працэнт выканання. Кіраўніцтва ЦК КП(б)Б абвінавáціла райкамы партыі і райвыканкамы ў тым, што яны “не ведут решительной борьбы с проявлением сопротивления в хлебопоставках и тем самым разлагают государственную налоговую дисциплину” [3, с. 414]. У выніку ў Полацкую вобласць было накіравана дадаткова каля 70 чалавек з кіруючага складу для аказання дапамогі ў правядзенні хлебанарыхтовак. Аплата падаткаў і выкананне паставак ажыццяўлялася з цяжкасцямі і каштавала сялянам іншы раз апошніх натуральных і грашовых зберажэнняў, што моцна адбівалася на ўзроўні жыцця, як сялян-калгаснікаў, так і сялян-аднаасобнікаў.

Рэспандэнты асобна ўзгадваюць сітуацыю з першымі пасадкамі калгасных палёў: “*Зерна сеяць не было і з Полацка насілі зярно на плячох, 40 кіламетраў. Такія во дзеўчанёчкі, па 20 кілаграм*” (Расонскі р-н)[36]; “*Мы ж семяну прыносілі з Полацка, як зажывалі калхоз после вайны. Сеяць то не чым было. Вот сперва шэсць чалавек за плугом становяцца, аром, узаралі кусочак, на заўтра ідзем за семяной. Вот мне было, 15 гадоў можа было мне. Я хадзіла ў Полацк. Мне пуд семяны на плечы. Я с Полацка несла дамоў. І каб ужо ні адну семянінку не узяўшы, там звешваюць нам па пуду і што б дамоў прынеслі, што б пуд быў гэты семяны* (Расонскі р-н) [37]. Пераважна усе работы ў першыя гады пасля вызвалення прыходзілася выконваць сваімі рукамі ў надзвычай складаных умовах “*Ой, страшная вешч…Мы ў траём галодныя,*

[32] ЗА у 2018 г. ад Гайбут Веры Кірылаўны, 1941 г.н., в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

[33] ЗА у 2019 г. ад Снежын Станіславы Грыгор’еўны, 1923 г.н., в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

[34] ФА ПДУ : Зап. Лобач У. у 2008 г. ад Харкевіч Надзеі Герасімаўны, 1925 г.н., в. Лабачова Бешанк. р-на.

[35] ЗА у 2019 г. ад Таратуткі Любові Ягораўны, 1927 г.н, в. Галоўчыцы Расонскага р-на.

[36] ЗА у 2019 г. ад Таратутка Любові Ягораўны, 1927 г.н, в. Галоўчыцы Расонскага р-на.

[37] ФА ПДУ : Зап. Сумко А. у 2019 г. ад Кандрацьевай Надзеі Антонаўны, 1928 г.н., в. Янкавічы Расонскага р-на.

*а мама на ноч, как эта, факелам свяціла трактару, а днём кароў глядзела*” (Расонскі р-н) [38]. Землі апрацоўваліся дрэнна і ўраджайнасць была нізкай. Амаль усю прадукцыю беларускія калгасы спачатку накіроўвалі ў фонд дзеючай арміі, а затым на адбудаванне і стварэнне новых галін прамысловасці, энергетыкі, гарадской гаспадаркі [9, с. 52–53]. Вяскоўцы ўзгадваюць, што ў паваенныя гады на працадні амаль нічога не давалі: “*Дзень работаеш, палку паставіць. Давалі грам сто гірсы. Яна пахожая на жыта, але лёгкая такая і там не х… нету унутры, усё раўно ж малолі*” (Полацкі р-н)[39] “*На трудадзень яны самае плахое зерно аддавалі нам*” (Расонскі р-н) [40].

Вяскоўцы ўзгадвалі пра тое, што іншы раз кіраўніцтва калгасаў, улічваючы складанасць сітуацыі, адпускала на пару месяцаў на “заробкі” аднаго працаздольнага з сям’і пасля выканання асноўных сезонных работ. Гэта было адной з актуальных стратэгій пасляваеннага часу і мела сваю спецыфіку ў разглядаемым рэгіёне. Матэрыялы вуснай гісторыі фіксуюць, что жыхары ўсходніх рёнаў перапраўляліся праз Дзвіну і хадзілі ў заходнія раёны, дзе пераважалі аднаасобныя гаспадаркі і была магчымасць заробіць: “*Іх там немцы не трогалі. Як толькі прыйшлі і нічога не было, то хадзілі ў Западную*” (Расонскі р-н)[41]. Распаўсюджанай практыкай была праца падлеткаў у аднаасобнікаў заходніх раёнаў. Жыхары заходніх раёнаў таксама хадзілі на часовыя заробкі, але ў напрамку Латвійскай ці Літоўскай рэспублік, працавалі пераважна за грошы: “*Мая мама служыла ў Латвіі, пасля вайны ў хазяіна, зямлі ў яго было многа, скаціна. Кароў там мама даіла. У нас пяцёра дзяцей, а коні ў нас здыхалі. А які хазяін без каня? Так вот паедзе, заробіць грошы. Два разы ездзіла, кідала малых рабят і ехала. Сезон работала: кароў даіла, бульбу капала*” (Пастаўскі р-н)[42]. Гэта спецыфічная адметнасць мела грунтоўны сацыяльна-эканамічны падтэкст, які сведчыў пра наяўнасць устойлівых сувязей паміж Заходнебеларускімі землямі, Латвіяй і Літвой, склаўшыхся ў межах працоўнай міграцыі ў перыяд знаходжання рэгіёна ў складзе Польшчы.

Матэрыялы вуснай гісторыі сведчаць пра тое, што ў разглядаемы перыяд, як для сялян-калгаснікаў, так і для сялян-аднаасобнікаў асноўную ролю ў жыццезабеспячэнні адыгрывала асабістая гаспадарка, аднаўленне якой было першачарговай задачай. Для сялян-аднаасобнікаў яна была адзінай крыніцай жыццезабеспячэння, а сяляне-калгаснікі спалучалі апрацоўку прысядзібнай гаспадаркі з працай у калгасе. Вядзенне прысядзібнай гаспадаркі патрабавала цяжкай працы і падаўжала агульную працягласць працоўнага дня калгасніка, а ўлічваючы дэмаграфічны складнік, вялася галоўным чынам высілкам жанчын: “…а *вечар, сонца зайшло і бягом бяжом, каждая пасадзіць агарод сабе і бабам старым*” (Верхнядзвінскі р-н) [43]. Асобная тэма, якая вельмі эмацыянальна гучала падчас аповяду – то, як “зажываліся”, бо ў разбураных раёнах ні было нават чым засеяць свой зямельны вучастак. “*А бульбу мы як па старцах хадзілі, то людзі давалі нам бульбу і мы тады неяк развялі.*” (Расонскі р-н)[44]. Вяскоўцы ўзгадвалі, што іншы раз садзілі шарлупкі ад бульбы, бо больш нічога не было, і збіралі ўраджай. На семяну мянялі рэчы, якія засталіся пасля вайны, ці, напрыклад, як на Расоншчыне насілі ў неспаленыя вёскі рыбу, мяняючы яе на зярно ці бульбу: “*У Пярэкі, там не згарэла. Дзед (муж) мой такіх харошых ляшчэй лавіў. Насіў у Зялёнку на зерне, каб засеяць. Мой бацька, усе насілі*” [45].

Вяскоўцы, узгадваючы пра пасляваенныя гады, адзначалі, што асабістая гаспадарка дазваляла дасягнуць пэўнай ступені гаспадарчай аўтаномнасці. Яна забяспечвала прадуктамі харчавання, сыравінай. Побач са збожжавымі ў структуры пасеваў важную ролю адыгрываў лён. Адбывалася вяртанне да даматканай вопраткі і самаробнага абутку. Частку прадуктаў і паслуг, якія выраблялiся сіламі хатніх гаспадарак, спажывалі ўнутры сям’і, а частка ішла на продаж. Прычым звяртае на сябе ўвагу спецыфічны характар пасляваенных абменна-гандлёвых аперацый, калі ва ўмовах адсутнасці грашовых сродкаў, паміж вёскамі фактычна адбываўся абмен, які ўсведамляўся сялянамі менавіта як гандлёвая аперацыя. Прадметам абмену звычайна выступалі дэфіцытныя рэчы, якія нельга было вырабіць у межах хатняй гаспадаркі (соль, цвікі, швейныя машынкі): “*Кароўку мы за машынку купілі тады. А машынка ў цёткі асталася з вайны за жалезнай дарогай. Як выязджалі ў парцізаны ўсё ж не саберыш. Ну, вот цётка забрала нашу машынку. А тады, як фронт прыйшоў, яна аддала нам машынку.* (А куды вы яе прадалі?*) – У Западную прадалі. Завязлі, з сястрой вазілі на санках зімой і купілі кароўку. Тут жа гола-гола было. Мы там, дзе прадалі машынку, там і карову купілі.* (Так вы можа абмянялі на карову?*) – Да, да*”. (Верхнядзвінскі р-н)[46]; “Вот, напрымер, драныі бліны знаіце такіі таўстыі? Дык там солі ні было у нас. Дзе Зябкі, насілі прадаваць гэты бліны туды, а нам давалі узамен соль” (Глыбоцкі р-н) [4, с. 261].

[38] ФА ПДУ : Зап. Лобач У., Сумко А.у 2019 г. ад Сапунова Пятра Аляксандравіча, 1938 г.н., в. Сядлова Расонскага р-на.
[39] ФА ПДУ : Зап. Лобач У., Сумко А. у 2018 г. ад Скачыхіна Васіля Міхайлавіча, 1936 г.н., Скачыхінай Ніны Ананьяўны, 1930 г.н, в. Мураўі Полацкага р-на.
[40] ФА ПДУ : Зап. Лобач У., Сумко А. у 2019 г. ад Сапунова Пятра Аляксандравіча, 1938 г.н., в. Сядлова Расонскага р-на.
[41] ЗА у 2019 г. ад Таратуткі Любові Ягораўны, 1927 г.н, в. Галоўчыцы Расонскага р-на.
[42] ЗА у 2016 г. ад Кісялёвай Чаславы Філіпаўны, 1942 г.н., в. Каліты Пастаўскага р-на.
[43] ЗА у 2019 г. ад Снежын Станіславы Грыгор’еўны, 1923 г.н., в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.
[44] ЗА у 2019 г. ад Высоцкай Таісіі Іванаўны, 1935 г.н., в. Галоўчыцы Расонскага р-на.
[45] ФА ПДУ : Зап. Сумко А. ад Кандрацьевай Надзеі Антонаўны, 1928 г. н., в. Янкавічы Расонскага р-на.
[46] ЗА 2018 г. ад Трапук Зінаіды Васільевны, 1932 г.н., у в. Азернікі Верхнядзвінскага р-на.

Архіўныя дакументы таксама падцвярджаюць спецыфічны характар і рэгіянальныя асаблівасці паваенных абменна-гандлёвых аперацый: “Всё население в исключительно тяжелых условиях. Стали восстанавливаться, приобретать скот в западных районах за последнюю одежду и другие предметы, на 3 – 5 хозяйств покупали корову, птицу” [10, л. 13].

Рэспандэнты ўзгадваюць, што сваеасаблівай “валютай” пры тавараабменных аперацыях, як у вясковым соцыўме, так і паміж горадам і вёскай мог выступаць самагон. З улікам таго, што самагонаварэнне было забаронена, абмен адбываўся таемна, прадаўцы і пакупнікі самагону загадзя ўдакладнялі і дамаўляліся наконт часу і месца продажу. У першыя пасляваенныя гады самагонаварэнне насіла пераважна камерцыйны характар, паколькі продаж самаробнага алкаголю даваў неабходныя грашовыя сродкі для аднаўлення ўласнай гаспадаркі, набыцця прадметаў першай неабходнасці, выплаты падаткаў: *“Трэба было жыць. Прадавалі (самагон) па-троху. Хлеба не за шта купіць, ні мукі купіць, нічога не было пасля вайны. Во як жылі. Дарма робілі. Калок і калок не запішыць, трудадзень. Во як”* (Расонскі р-н)[47] Самагонаварэнне разглядалася як эфектыўны спосаб “канвертацыі” сельскагаспадарчай прадукцыі ў “жывыя грошы”, якія атрымаць за працу ў пасляваенным калгасе было практычна немагчыма [11, с. 62]. Пры гэтым, найбольшы размах самагонаварэнне мела ў заходніх раёнах воблаці, дзе аднаасобныя гаспадаркі мелі рэсурсы для вырабу хатняй гарэлкі.

Асноўнымі кропкамі збыту сялянскай прадукцыі ў рэгіёне былі гарады, чыгуначныя станцыі, дзе насельніцтва атрымлівала заробак грашыма. Вяскоўцы насілі прадаваць на кірмаш яйкі, малако, рыбу: *“Яйцо, сметану, масла збівалі і ўсе на налогі. Вазілі ў Полацк і прадавалі. У Варонічы трэба было занесці малако. Масла аддасі – грошы палучыш – налог заплаціш. Калатуху варылі. Шчавельнік вялікі кацёл варылі і елі, і галодныя хадзілі.”* (Полацкі р-н)[48]. Напрыклад, на рынку ў Дрысе асноўнымі прадаўцамі збожжа і вытворных ад яго прадуктаў былі жыхары заходніх раёнаў: *“Я хадзіла з мамай на рынак у Дрысу. Большінство былі з Заднай, большынство былі крэпкія. Нашых мала было. Нашы яшчэ не такія былі, а тыя... Прадавалі масла, тварог, смятану, яйцо. Зберуць за нядзелю, ну і пруць тады. У каго конь свой быў, ён пасадзіць паню сваю, яна прадасць. Яны аднаасобнікі былі. (А што яны куплялі?). – Усё на свеце. Трапкі куплялі. Яны хлеб не куплялі. У іх хлеб свой быў”* (Верхнядзвінскі р-н)[49]. Неабходна адзначыць, што адносная эканамічная стабільнасць заходніх раёнаў паўночнай Беларусі на фоне татальнага спусташэння рэгіёну, які ўваходзіў у зону тылу групы арміі Цэнтр, прывёў да яшчэ больш выразнага ўнутрыэтнічнага падзелу на "заходнікаў" і "ўсходнікаў" з шырокім спектрам узаемных сацыякультурных стэрэатыпаў, артыкуляваных ва ўспамінах пра апошнія гады Вялікай Айчыннай вайны: “*Ну, западонцы, ну хто прадаець, хто муку прывязе, хто хлеб прадаець. Вот ідзеш на базар, а яны едуць на калёсах там удваіх, утраіх, ідзеш і сам сабой гаворыш, во каб ты не вярнуўся. Яны ж на калёсах ужо не пяшком хадзілі, гэта мы калхознікі даўней хадзілі пяшком, які нас чорт вазіў нам нечым было, я сама ў Бабынічы малако насіла вось з Лесава аж у Бабынічы сем кіламетраў, на каромысла па два чалавекі і насілі малако здавалі пакуль калхоз каня не зажыў. Хадзілі у Западную мы после вайны, дык туда пойдзем дык яны нас ганялі там: "Тарбэшнікі прыйшлі". Бо яны багацеі, немцы ж не чапалі там.* (Полацкі р-н)[50]; **“**Тады яны нас звалі *тарбэчнікі.* За то, што мы хадзілі туды, у іх пабіраліся [51] (Полацкі р-н). Сацыяльныя бар’еры, узаемныя сацыякультурныя стэрэатыпы былі даволі важкім фактарам узаемадачынення гэтых рэгіёнаў, але гэта праблема асобнага артыкула.

**Заключэнне.** Такім чынам, характар і змест успамінаў сялян Паўночнай Беларусі пра “выжыванне пасля вызвалення” мае істотную геаграфічную дэтэрмінаванасць. Значная розніца ва ўспрыняцці падзей абумоўлена неаднолькавым сацыяльна-эканамічным укладам і стартавымі ўмовамі пасляваенага аднаўлення, бо заходнія рэгіёны з большага знаходзіліся ў лепшай гаспадарчай сітуацыі, чым усходнія, дзе нацысты ў барацьбе з партызанамі праводзілі палітыку “выпаленай зямлі”. Адносная заможнасць жыхароў заходніх раёнаў у параўнанні з гаротным станам сялян з усходу актуалізавала падзел на “заходнікаў” і “ўсходнікаў” з шырокім спектрам узаемных сацыякультурных стэрэатыпаў. У складаных эканамічных умовах ваеннага часу на вызваленых ад нацыстаў тэрыторыях вялікае значэнне ў жыццезабеспячэнні мелі такія фактары, як ступень разбуранасці мясцовасці, наяўнасць працаздольных членаў сям’і і магчымасць апрацоўваць зямлю, сацыяльна-эканамічны ўклад, месца ў грамадскай сістэме каардынат, сацыяльны клімат у вясковай грамадзе. Цэнтральнае месца ва ўспамінах вясковага насельніцтва аб 1944 – 1945 гг. займаюць праблемы элементарнага жыццезабеспячэння, ці, працей кажучы, фізічнага выжывання.

Матэрыялы вуснай гісторыі сведчаць, што ваенная рэчаіснасць пасля вызвалення ад нацысцкай акупацыі захавала сваю злабадзённасць. Гэта магла быць непасрэдная пагроза для жыцця: як ад незлічонай колькасці боепрыпасаў, што засталіся пасля баёў на палетках і лясах краю, так і ад шматлікіх узброеных груп, якія

[47] ФА ПДУ: Зап. Лобач У., Сумко А. у 2016 г. ад Селезнёвай Лідзіі Аляксандраўны, 1929 г.н.,в. Кульнева Расонскага р-на

[48] ФА ПДУ: Зап. Лобач У., Сумко А. у 2018 г. ад Маісеенка Марыі Філіпаўны, 1931 г.н. у в. Мураўшчына Полацкага р-на.

[49] Зап. у 2018 г. ад Гайбут Веры Кірылаўны, 1941 г.н. у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

[50] ФА ПДУ : Зап. Лобач У., Сумко А. у 2018 г. ад Скачыхіна Васіля Міхайлавіча, 1936 г.н., Скачыхінай Ніны Ананьяўны, 1930 г.н, в. Мураўі Полацкага р-на.

[51] ФА ПДУ: Зап. у 2018 г. ад Мароз (Бакан) Надзеі Іванаўны, 1924 г.н., в. Быстрыца Полацкого р-на.

змагаліся з савецкай уладай (пераважна ў Заходня Беларусі) ці папрост займаліся рабаўніцтвам. Аднак найбольш востра стаяла праблема фізічнага выжывання на спустошанай тэрыторыі, калі пагроза гвалтоўнай смерці ад нацыстаў ці паліцаяў знікла, а на першае месца выйшла пагроза смерці ад недаядання. Вусны дыскурс голаду і экстрэмальнай гастраноміі фіксуецца пераважна ва ўсходніх раёнах рэгіёну. Аднак і ў заходніх раёнах уключэнне ў паўсядзённы рацыён раслінных прадуктаў – сурагатаў – было значна пашырана. У гэты час актуалізуюцца этнабатанічныя веды пра расліны, іх харчовыя і лекавыя уласцівасці; актыўна выкарыстоўваюцца традыцыйныя метады лячэння. Важнымі дадатковымі крыніцамі жыццезабеспячэння сталі разнастайныя промыслы, што мелі як легальны (збіральніцтва, рыбалоўства), так і крымінальныя (самагонаварэнне, крадзёж калгснай маёмасці) характар.

У разглядаемы перыяд для савецкага ўрада адной з першачарговых задач з'яўлялася забеспечэнне неабходнага ўзроўню вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі для дапамогі фронту і мабілізацыя насельніцтва на выкананне абавязковых паставак, што былі з большага непад'ёмнымі для жыхароў знішчаных вёсак. Менавіта сведчанні вяскоўцаў даюць уяленне, як людзі выжывалі ў гэты складаны час, выкарыстоўваючы розныя стратэгіі (жабрацтва, зыход з калгасаў на "заробкі" і г.д.). Матэрыялы вуснай гісторыі сведчаць пра тое, што ў разглядаемы перыяд для сельскага насельніцтва "пасляваеннае аднаўленне" азначала перш за ўсё аднаўленне асабістай гаспадаркі, разбуранай вайной, якая з'яўлялася асноўнай крыніцай жыццезабеспячэння сялянскай сям'і (як для "заходнікаў", так і для "ўсходнікаў"). Прысядзібная гаспадарка, ва ўмовах крытычна недастатковых матэрыяльных рэсурсаў, атрыманых калгаснікамі за працу на дзяржаву, гарантавала пэўны ўзровень дабрабыту, таму сяляне-калгаснікі імкнуліся па магчымасці мінімізаваць працоўны ўдзел у калгасе і выпрацоўвалі розныя стратэгіі выжывання. Матэрыялы вуснай гісторыі фіксуюць, што жорсткія ўмовы пасляваеннага аднаўлення выклікалі да жыцця альбо актуалізавалі нетыповыя формы эканамічнай і гандлёвай актыўнасці сялян, дзе сярод традыцыйных заняткаў паўсталі і нелегальныя формы гандлёвага прадпрымальніцтва і ў першую чаргу – выраб і збыт нелегальнага алкаголю.

## ЛІТАРАТУРА


1. Лобачевская, О. Ритуал в повседневности войны (об архаической ритуальной практике в годы Второй мировой войны в Беларуси) / О. Лобачевская // Homo historicus 2009. Гадавік антрапалагічнай гісторыі ; пад. рэд. А. Ф. Смаленчука – Вільня : ЕГУ, 2010. – С. 38 – 53.
2. Іванова, В. Прамоўленая гісторыя: ХХ ст. у памяці жыхароў беларускай вёскі / В. Іванова. – Мінск : Зміцер Колас, 2018. – 448 с.
3. Витебщина освобожденная : октябрь 1943 – декабрь 1945 : док. и материалы / сост.: Н. В. Воронова [и др.]. – Витебск : Витеб. обл. тип., 2009. – 584 с.
4. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 2. Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. / Уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 2. – 368 с.
5. Народная медыцына беларусаў Падзвіння // Полацкі этнаграфічны зборнік : у 2 ч. / Аўт.-склад. У. А. Лобач, У. С. Філіпенка. – Ч. 2. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – 148 с.
6. Великая Отечественная война в зеркале народной речи и фольклора : Тексты. Исследования. Аудиоприложение / Под общ. ред. Н. В. Большаковой. – Псков: ЛОГОС, 2016. – 332 с.
7. Kashtalian, Iryna. The Repressive Factors of the USSR's Internal Policy and Everyday Life of the Belarusian Society (1944–1953) / Iryna Kashtalian. – Harrassowitz Verlag Wiesbaden, 2016.
8. Послевоенное развитие Глубокского района: 1944 – 1950 гг. : док. и материалы / Сост. Н. А. Боровик [и др]. – Минск : Медисонт, 2010. – 424 с.
9. Смяховіч, М. У. Аплата працы ў калгасах і саўгасах БССР (1944 – 1985 гг) / М. У. Смяховіч // Весці Нац. Акад. навук Беларусі. – 2015. – № 3. – С. 50 – 60.
10. Занальны дзяржаўны архіў горада Полацка. – Ф. 1093. Воп. 1. Спр. 9.
11. Сумко, А. В. Легальныя і крымінальныя спосабы жыццязбеспячэння беларускай вёскі ў перыяд пасляваеннага аднаўлення (на прыкладзе Полацкай вобласці) / А. В. Сумко // Вестн. Полоц. гос.ун-та. – 2019. – № 1. – С. 55 – 62.


*Пастуніў 26.07.2019*

## SURVIVAL AFTER RELEASE: THE VILLAGE IS NORTH OF BELARUS IN THE DISCOURSE OF ORAL HISTORY 1944–1945

***A. SUMKO***

*The specificity of life support of the Belarusian village in the conditions of the destroyed economy in wartime in the territories liberated from the Nazis is considered. The sources were the materials of oral history, allowing to understand the dynamics of the problem and to fix a certain picture created by the collective memory of the population of Northern Belarus. The text presents the results of field expeditions of the 2000s.*

***Keywords:*** *post-war reconstruction, extreme gastronomy, hunger, village, agriculture, exchange and trade.*